# ЗАСНАВАЛЬНІКІ
# АЙЧЫННАЙ ЭТНАКУЛЬТУРАЛОГІІ

Гісторыя айчыннай этнакультуралогіі ўяўляе сабой непарыўны працэс даследавання духоўнай спадчыны як часткі беларускага этнасу. Пачатак аб'ектыўнага навуковага асэнсавання здабыткаў у галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў адносіцца да XIX ст. Хаця зачаткі імпліцытных этнакультуралагічных ведаў можна заўважыць у агіяграфічнай літаратуры і летапісах. У «Жыціі Ефрасінні Полацкай», «Жыціі прападобнага Аўрамія Смаленскага», а таксама ў Полацкім, Слуцкім, Супрасльскім летапісах адлюстроўваліся важнейшыя тэндэнцыі культурна-гістарычнага жыцця сярэдневяковай беларускай супольнасці[1]. Безумоўна, духоўна-маральнае развіццё грамадства трактавалася з пазіцыі хрысціянскай этычнай дактрыны, якая пачала распаўсюджвацца на беларускіх землях з канца X ст.

Заснавальнікамі этнічна-патрыятычнай традыцыі ў гісторыі беларускай культуры і грамадскай думкі з'яўляліся Францыск Скарына, Сымон Будны, Мікола Гусоўскі, Лаўрэнцій Зізаній, Васіль Цяпінскі і іншыя асветнікі-гуманісты. Яны здолелі вызначыць пасіянарнасць, жыццяздольнасць беларускай народнасці і яе культуры. Паводле іх меркаванняў, імі з'яўляліся працавітасць, сумленнасць, бязмежная любоў да роднага краю, глыбокая маральнасць, зладжаная і гарманічная сістэма жыццёвых правіл, прыярытэтаў, звычаяў, абрадаў, духоўных светаўяўленняў і традыцый.

Этнакультурная інтэнцыянальнасць уласціва творчасці мысліцеляў эпохі Асветніцтва. Прадметам свядомасці Сімяона Полацкага, Язэпа Даманеўскага, Казіміра Нарбута, Станіслава

---

[1] Летапісы беларускія // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 4 : Кадэты – Ляшчэня / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: М. В. Біч [і інш.] ; прад. М. Ткачова ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 1993. – С. 356–357.

Шадурскага і інш. былі аб'екты духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў. У сваіх навуковых трактатах яны ўсебакова адлюстроўвалі побыт, надзённыя праблемы і духоўнае жыццё тагачаснага беларускага грамадства.

XIX стагоддзе адметна паскораным выспяваннем самасвядомасці беларускага народа пад уплывам разгортвання дэмакратычнага руху. Этнакультурная кансалідацыя беларускага грамадства абумовіла неабходнасць навуковага спасціжэння гісторыі і культуры беларускага этнасу. У другой палове XIX ст. актывізуецца навуковая дзейнасць беларускіх даследчыкаў па вывучэнні этнагенезу, культуры, мовы і фальклору беларусаў. У гэты перыяд А. Багдановічам, Я. Карскім, А. Кіркорам, І. Насовічам, М. Нікіфароўскім, Е. Раманавым, А. Сержпутоўскім сабраны і апісаны разнастайныя артэфакты беларускай духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў.

Шматграннасцю і навуковай фундаментальнасцю адметны даследаванні братоў К. П. Тышкевіча і Я. П. Тышкевіча. Авалодаўшы ў краінах Заходняй Еўропы метадалогіяй археалагічных і культурна-гістарычных даследаванняў, яны вывучалі сотні крывіцкіх курганоў і пахавальных інвентароў Лагойшчыны. На падставе знойдзеных археалагічных артэфактаў даследчыкі вызначылі дакладна тэрыторыю рассялення крывічоў.

Адначасова з археалагічнай дзейнасцю Тышкевічы грунтоўна вывучалі фальклор беларусаў. Імі запісана і прааналізавана вялікая колькасць легенд, паданняў, прыказак, прымавак, народных песень, а таксама калядных і памінальных абрадаў.

Асобным кірункам іх этнаграфічных даследаванняў была народная медыцына беларусаў. У працы Я. П. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета…» ёй прысвечаны асобны раздзел[2]. Яму належыць і праца «Зельнік Барысаўскага павета», у якім утрымліваюцца паданні аб травах пераважна абрадавага і лекавага прызначэння з характарыстыкай кожнай расліны.

---

[2] *Tyszkiewicz E.* Opisanie powiatu borysowskiego pod względem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemysłowo-handlowym i lekarskim: z dodaniem wiadomości o obyczajach, spiewach, przysłowiach i ubiorach ludu, gusłach, zabobonach i t. d. – Wilno : Drukarnia Ant. Marcinowskiego, 1847. – 446 s.

Вывучэнню лекавых раслін значную ўвагу надавалі амаль усе беларускія этнографы і фальклярысты. У этнаграфічных працах П. Шпілеўскага[3], М. Федароўскага[4] і інш. нярэдка даюцца апісанні лекавых раслін і рэкамендацыі па іх выкарыстанні ў лячэбных мэтах.

Калектыў кафедры культуралогіі на працягу 20 гадоў займаецца даследаваннем гісторыі і культуры Беларусі, вынікам якога з'яўляюцца манаграфіі, навуковыя зборнікі і даклады на шматлікіх навуковых канферэнцыях. Адным з кірункаў навуковай дзейнасці супрацоўнікаў кафедры стала этнакультурная спадчына Пія Феліцыянавіча Тышкевіча, яго сыноў Канстанціна і Яўстафія. Вынікі навуковых даследаванняў падводзяцца падчас правядзення Тышкевіцкіх чытанняў, у якіх прымаюць удзел вучоныя, краязнаўцы і ўсе, хто цікавіцца культурна-гістарычнай спадчынай беларускага народа. Як правіла, навуковыя чытанні праводзяцца ў месцах, якія звязаны з даследчай і грамадскай дзейнасцю прадстаўнікоў графскага роду Тышкевічаў. У папярэдніх чытаннях актыўны ўдзел прымалі навукоўцы і творчая інтэлігенцыя Барысава, Валожына, Вілейкі, Лагойска, Мінска, Свіслачы.

***

Сёлетнія X Тышкевіцкія чытанні адбудуцца на Мядзельшчыне і прысвячаюцца фальклорна-этнаграфічнай спадчыне не толькі Тышкевічаў, але і іншых беларускіх фальклярыстаў і этнографаў, у працах якіх утрымліваюцца матэрыялы па культуры лекавых раслін. Мядзельшчына з'яўляецца тэрыторыяй рассялення крывічоў, аб чым сведчаць іх курганныя могільнікі, якія ў свой час даследавалі Тышкевічы. Акрамя таго, на тэрыторыі Мядзельскага раёна існуе «Аптэкарскі сад», дзе вырошчваюцца, даследуюцца лекавыя якасці розных раслін і на іх ас-

---

[3] *Шпилевский П. М.* Путешествие по Полессью и Белорусскому краю / предисл., текстолог. подгот., примеч. и коммент. С. А. Кузняевой. – Минск : Полымя, 1992. – 251 с. – (Литературные памятники Белоруссии).

[4] *Federowski M.* Lud białoruski na Rusi Litewskiej. – Krakow : Panstwowy Instytut Wydawniczy, 1897. – T. l. – 753 s.

нове выпрацоўваюцца рэкамендацыі па выкарыстанні ў лячэбных мэтах.

Геаграфія ўдзельнікаў юбілейных чынанняў і тэматыка дакладаў значна пашырылася, што сведчыць аб цікавасці сучаснікаў да духоўнай спадчыны заснавальнікаў айчыннай культуралогіі.

Паважаныя ўдзельнікі і арганізатары канферэнцыі, маладыя вучоныя, дазвольце выказаць вам словы падзякі за ўдзел у канферэнцыі, яе падтрымку і развіццё.

Жадаю ўсім удзельнікам юбілейных X Тышкевіцкіх чытанняў паспяховай і плённай працы, канструктыўнага дыялогу, новых дзелавых кантактаў і сумесных праектаў для рэалізацыі ўсіх намечаных планаў!

*А. Я. Корсакава,*
прарэктар па навуковай рабоце ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»